№4 (187)

ПАХОДНЯ

Грамадска-палітычная газета

Люты 2015 г.

КАЛОНКА НАВІН

У краіне

ЗВР Беларуси упали ниже психологического уровня в $5 млрд.

Золотовалютные резервы Беларуси в январе потеряли $334,4 млн. после $760 млн. снижения в декабре минувшего года и таким образом опустились ниже психологического уровня в 5 млрд. долларов.

На 1 февраля 2015 года они составили 4724,7 млн. долларов, сообщает Национальный статистический комитет РБ.

Еще на 1 января 2015 года ЗВР оценивались в 5,059 млрд. долларов, на 1 января 2014 года – 6,651 млрд. долларов.

У Прыдняпроўі

Уровень денежных доходов населения Могилевской области снизился больше, чем в других регионах Беларуси.

В 2014 году общий объем денежных доходов населения по республике составил 522,1 трлн. рублей, в расчете на душу населения – 4 592 тыс. рублей в месяц. Как сообщает Белстат, реальные располагаемые денежные доходы населения в 2014 году к уровню 2013 года выросли только в Минске и Минской области (на 2,3% и 0,3% соответственно). Во всех остальных областях Беларуси они снизились, больше всего доходы уменьшились у жителей Могилевской области - на 2,8% (в Витебской – на 1%, в Гомельской – на 0,6%, в Брестской – на 0,5, в Гродненской – на 0,4%).

У раёне

В лесу в Белыничском районе сгорел трактор.

Трактор с оборудованием для валки леса загорелся днем 15 февраля в лесу около деревни Ослевка Белыничского района.

Огонь повредил кабину, двигатель и задние колеса трактора. Предполагаемая причина пожара - короткое замыкание электропроводки, сообщает mogilevnews.by.

КОШТЫ РАСТУЦЬ, А МЫ ЎСЁ ЧУЕМ ПРА “КВІТНЕННЕ”…

Згодна афіцыйных дадзеных галоўнага статыстычнага ўпраўлення Магілёўскай вобласці, цэны на харчовыя тавары ў рэгіёне за год (з студзеня 2014-га па студзень 2015-га) выраслі на 17,2%. Найбольш падаражэлі мяса і птушка (23,9%), садавіна (23,4%), каўбасныя вырабы і крупы (па 22,8%).



Кошты на прамтавары падняліся на 9,7%. Больш за ўсё яны выраслі на медыкаменты (26,1%), бензін (25,8%), сінтэтычныя мыючыя сродкі (12,5%).

Ну а найбольш у Магілёўскай вобласці выраслі кошты на платныя паслугі насельніцтву (31,1%). Так, у нашай “сацыяльнаарыентаванай” краіне, пра што так любяць распавядаць казкі магілёўскія чыноўнікі, кошты на паслугі дзіцячых дашкольных устаноў выраслі на 94,4%, паслугі канцэртных арганізацый падаражэлі за год на 82,6%, турыстычныя – на 54,8%.

Карацей, бялынічанін, працуй за два-тры мільёны “зайчыкаў” (калі здолееў гэтую працу знайсці), еш бульбу з капустай, а пра нейкія буржуінскія краіны і канцэрты нечага марыць…

Прычым, паважаныя чытачы, гэтыя лічбы росту коштаў літаральна на ўсё браліся яшчэ да пачатку абвалу нашага слаўнага беларускага “зайчыка” адносна долара ЗША і іншых буржуінскіх валют, а таксама да сканчэння забароны на падвышэнне цэн, якое ўвялі нашыя родныя ўлады. Зараз цэны падвысіліся нашмат больш, вы самі можаце гэта ўбачыць пры кожным наведванні крамы ў Бялынічах, асабліва калі захочаце набыць тую ж садавіну ці рыбу.

Зразумела, што бываюць у развіцці краіны разнастайныя крызісы (праўда, у мяне такое ўражанне, што ў нас яны чамусьці ніколі не сканчаюцца), дык ужо б “не трындзелі” пра нечуваны росквіт і дасягненні ў дзяржаўных СМІ ў матэрыялах да “адзінага дня інфармавання”, як быццам бы людзі не бачаць рэальную сітуацыю ў вобласці і краіне. Згодна тых жа афіцыйных дадзеных беларускіх статыстыкаў, за мінулы год рэальныя грашовыя даходы насельніцтва Магілёўскай вобласці зменшыліся на 2,8%, а

(Працяг на стар. 7)

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

ТЕХТИНСКАЯ МОШЕННИЦА

Жительница деревни Техтин Белыничского района обманула пенсионерку и пыталась обойти закон. Вместе с семьей она заняла квартиру 84-летней женщины в Могилеве и вывезла бабушку в деревенский дом - без отопления и удобств.



В мае 2011 года жительница деревни взяла пожилую могилевчанку на иждивение. Договор пожизненного содержания нотариально заверили и зарегистрировали, сообщили в прокуратуре. По нему женщина получала 1-комнатную квартиру бабушки по проспекту Мира в Могилеве, но должна была ухаживать за пенсионеркой, которая оставалась жить в квартире. Она брала на себя обязательства обеспечивать пожилую женщину едой и одеждой, лекарствами, оказывать необходимые бытовые услуги.

В январе 2012 женщина с согласия бабушки вселилась в квартиру вместе с мужем и двумя малолетними детьми, зарегистрировалась в ней.

После информации, полученной из управления по труду, занятости и социальной защите Белыничского райисполкома, прокуратура Могилева провела проверку. Выяснилось, что принятые на себя обязательства женщина не выполняла. Пенсионерку отвезли в деревенский дом, где она фактически жила в антисанитарных условиях, без отопления и удобств. Все это время жительница Техтина с семьей жили в благоустроенной квартире в областном центре.

Суд Ленинского района Могилева полностью удовлетворил иск о расторжении договора пожизненного содержания с иждивением. Также было принято решение выселить недобросовестную женщину из 1-комнатной квартиры в Могилеве без предоставления другого жилого помещения.

Tut.by

ПРОВЕРКА НА ДОРОГАХ

В Белыничском районе задержан автомобиль, перевозящий 82 дождевика без документов.

На автодороге вблизи д. Головчин сотрудники отделения ГАИ и группы БЭП Белыничского РОВД задержали грузопассажирский микроавтобус «Мерседенс-Бенц Спринтер». Управлял транспортным средством 26-летний могилевчанин, водитель одного из предприятий областного центра.

В грузовом отсеке автомобиля находились дождевики из мембранной ткани, сырьё для пошива подобных изделий и необходимая фурнитура. Указанные изделия планировалось перевезти из Могилёва в цех предприятия, находившийся в г.п. Круглое.

На часть груза водитель не смог предъявить оперативникам товарно-транспортных накладных. 82 дождевика на сумму 16 400 000 рублей изъяты.

Перевозка товара без соответствующих документов чревата административным взысканием в виде штрафа с возможной конфискацией товара, сообщает uvd.mogilev.by.

У МАГІЛЁВЕ ЎСТАЛЮЮЦЬ МЕМАРЫЯЛЬНУЮ ШЫЛЬДУ Ў ГОНАР РЭЖЫСЁРА БЯЛЫНІЦКАГА НАРОДНАГА ТЭАТРА

У Магілёве з'явіцца мемарыяльная шыльда ў гонар Валянціна Ермаловіча (1925 — 2004), акцёра, рэжысёра, заслужанага работніка культуры БССР, кіраўніка народных тэатраў у Бялынічах і Магілёве, грамадскага дзеяча, брата знакамітага гісторыка Міколы Ермаловіча. Днямі стала вядома пра станоўчае рашэнне ў гэтай справе Магілёўскага гарвыканкама.

Ініцыятарамі ўсталявання мемарыяльнай шыльды выступілі выкладчыкі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Куляшова сацыёлаг Яраслаў Клімуць і гісторык Ігар Пушкін. У мінулым годзе яны накіравалі ліст мясцовым чыноўнікам з просьбай ушанаваць памяць Ермаловіча.

"Мы выступілі ўдваіх ініцыятарамі. Склалі ўсе неабходныя дакументы, якія былі разгледжаны 23 траўня і 15 жніўня 2014 года на пасяджэннях гарадской камісіі па тапаніміцы і ўшанаванню гістарычнай і культурнай спадчыны Магілёва. Там была падтрымана ініцыятыва ўшанавання памяці Валянціна Іванавіча Ермаловіча і таксама зацверджаны тэкст мемарыяльнай шыльды", — кажа Ігар Пушкін.

Паводле слоў гісторыка, шыльда будзе ўсталявана на доме №46 па вуліцы Першамайскай у Магілёве, дзе на працягу 50 гадоў жыў Валянцін Ермаловіч. Тэкст на шыльдзе наступны: "У гэтым доме жыў заслужаны работнік культуры БССР, акцёр, рэжысёр, Валянцін Ермаловіч".

"Гэты дом у Магілёве вядомы, як дом акцёраў. Калісьці Валянцін Ермаловіч прыехаў у Магілёў разам з трупай Пінскага тэатра і менавіта з гэтага моманту быў адроджаны Магілёўскі абласны драматычны тэатр", — гаворыць Ігар Пушкін.

Валянцін Ермаловіч пасля сканчэння кар'еры акцёра выкладаў у Магілёўскай вучэльні культуры, спрыяў у адраджэнні шасці народных тэатраў, у тым ліку ў Бялынічах, Краснаполлі і Магілёве. Быў сябрам Таварыства беларускай мовы і першым кіраўніком філіі "Мартыралога Беларусі".

Праект шыльды быў зроблены скульптарам Уладзімірам Кананавым. Яна будзе выраблена з граніта і бронзы за кошт пазабюджэтных сродкаў. Актывісты дэмакратычных арганізацый Магілёўшчыны ўжо пачалі збор сродкаў на выраб і ўсталяванне мемарыяльнай шыльды. З'явіцца шыльда сёлета, але дакладная дата ўсталявання пакуль невядомая.

На территории Могилёвской области имеется 15 убыточных сельскохозяйственных организаций, или 7,7% к общему количеству убыточных организаций области. Сумма их чистого убытка составляет свыше 187 млрд. рублей.

ДУШНО!!!

Наверное, глупо в нашей стране чему-либо ещё удивляться, но эта «мышиная возня», именуемая «борьбой с тунеядством», никак не может оставить равнодушным любого хоть мало-мальски здравомыслящего человека. Уже не смешно, что в эту «свистопляску» вовлечены не только госструктуры в лице исполкомов, органов МВД и прокуратуры, но и те, кого мы выбираем для решения наших проблем – депутаты районных и областных Советов.

Хотя странно, а каким это боком люди, которые должны быть посредниками между властью и народом, становятся ещё одним репрессивным аппаратом по отношению к своим избирателям? И если ещё можно понять, почему райсовет взялся за решение проблем населения, которое занимается разведением и содержанием домашней живности (кто в нашем обществе ещё поможет!), хотя и эту проблему должен решать райисполком, потому что она в 2012 году была поднята на государственном уровне. Но вот почему депутаты должны заниматься выявлением и привлечением «тунеядцев» к общественно полезному труду, я никак не могу понять. Хотя теперь я по-другому взглянула на события десятилетней давности, когда сама была депутатом районного совета и нас обязали «считать собак по дворам», так как какому-то умнику пришло в голову обложить домашних Дружков и Бобиков налогом, чтобы пополнить районный бюджет. Благодаря моему высмеиванию и привлечению внимания независимой прессы, эту абсурдную «идею» отменили, но сама идея пополнения бюджета хоть каким-то образом продолжала жить в головах не только наших, районных, чиновников, но и тех, которые нами «правят». Потому что чем отличается пересчёт собак от пересчёта «тунеядцев»? И там и там нужно знать количество данных особей. Только я не могу понять, почему этим должны заниматься депутаты. Я бы поняла, если бы они стали требовать открытия новых предприятий, создания



новых рабочих мест, стали изучать проблемы занятости населения, с целью этому населению помочь. То есть, занялись бы своими прямыми обязанностями перед народом. Ведь мы их для того и выбираем, чтобы в трудную минуту было к кому обратиться за помощью.

Беда в том, что в нашем обществе перемешались все понятия, и мы живём не так, как живёт любая современная страна, в которой развивается демократия. И вот у нас уже существуют не общественные приёмные при райсоветах и облсоветах, а какие-то конторы, под названием «одно окно». И в этих конторах заняты люди, при обращении к которым мы вынуждены открывать десятки дверей, потому что сами они ничего не решают. В то же время через пару месяцев после выборов мы забываем, кого же мы выбрали своим депутатом, потому что совсем непонятно, а где я могу с ним встретиться, чтобы обсудить свою проблему.

То, что в стране существует проблема занятости – это уже не открытие, а констатация факта. Мы платим за то, что в угоду «хорошей отчётности» скрывали безработицу. Нам так хотелось доказать всему миру! (а зачем?), что наша «модель развития» уникальна, что безработица у нас занимает всего десятые доли процента. И что же? Во что вылилась наша страусиная позиция? Наша скрытая система занятости работников в производительном труде привела к тому, что бюрократический аппарат разросся до немыслимых пределов, который уже невозможно прокормить, а в то же время количество рабочих мест постоянно сокращалось. Мы рубили сук, на котором сидим. Самые трудолюбивые и творческие люди уезжали из страны на «заработки», а те, что оставались, - развращались унизительным отношением к ним руководством тех, ещё немногочисленных предприятий, что держались «на плаву». Престиж труда упал так низко, что многие не считают зазорным вообще не работать. Немаловажную роль сыграл и фактор оплаты труда. Человека вынуждают «работать» за «копейки», которые у нас называют миллионами. Во всём мире нет столько миллионеров, как в нашей стране. И это при том, что уже, за двадцать лет, откинули четыре нуля. И если их добавить, то коробка спичек фактически стоит 3 000 000 белорусских «зайчиков». Сейчас снова уже на протяжении более трёх лет чиновники решают задачу «убрать или не убрать» ещё три нуля с наших денег, но только жить нам становится всё труднее. И, наверное, вопрос на обсуждение надо ставить более актуальный: не пришла ли пора «убрать» часть чиновников, многие из которых уже являются «заслуженными» пенсионерами? Чтобы не мешали молодым работать. А заодно и пересмотреть систему выборов, потому что все наши беды начинаются

(Окончание на стр. 4)

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

МІКАЛАЙ СТАТКЕВІЧ СПАДЗЯЕЦЦА НА АБ’ЯНАННЕ КАЛЕГАЎ ПА АПАЗІЦЫІ

Палітвязень Мікалай Статкевіч, адзіны з кандыдатаў у прэзідэнты на прэзідэнцкіх выбарах 2010 года, якія застаецца за кратамі, выказаў спадзяванне на тое, што яго “калегі па апазіцыі” аб’яднаюцца хоць нейкім чынам вакол ідэі аб яго вылучэнні ў якасці адзінага кандыдата.

Свае спадзяванні палітвязень выклаў у лісце да бялыніцкага журналіста Барыса Вырвіча, які той атрымаў 14 лютага. Ліст быў напісаны Мікалаем Статкевічам у Шклоўскай ПК-17 7 лютага.

У прыватнасці, выказваючыся пра ідэю аб сваім вылучэнні ў якасці адзінга кандыдата на прэзідэнцкіх выбарах 2015 года ў Беларусі і паведамленнях прэсы аб некалькіх намерах стварыць ініцыятыўную групу ў яго падтрымку, Мікалай Віктаравіч піша “… спадзяюся, штоініцыятыўная група будзе адна і калегі па апазіцыі аб’яднаюцца хоць такім чынам. Дзеля гэтага я і даў згоду на гэты план, бо проста “піяр” мне нецікавы. Ды і сітуацыю маю гэта не палепшыць, калі не наадварот. Але дзеля аб’яднання я патрываю. Тым болей, што сілаў у мяне вытрываць усё хопіць. Нягледзечы на пашпартны ўзрост”.

Мікалай Статкевіч у лісце таксама распавёў пра ўмовы свайго ўтрымання ў шклоўскай калоніі. Палітвязень піша, што тут ён зараз апынуўся абмежаваны ў доступе да інфармацыі з волі, “бо тут крыху заблыталі з падпіскай. У выніку з сярэдзіны студзеня і ў лютым апынуўся без газет, за выключэннем “Новага часу”. Ды і той прыносяць не ўсе нумары і са спазненнем ледзь не на тыдзень. Яшчэ з крыніцаў інфармацыі ў атрадзе ёсць адзіны тэлевізар, які дазваляецца глядзець раніцай і ўвечары. Праўда, занадта часта забіраць у маіх калегаў магчымасць паглядзець DVD-серыялы ці музыку …, каб паслухаць навіны, сумлення не хапае. Бо радасцяў у іх і так небагата. Але ж за асноўнымі падзеямі сачу.

Тут працаваць на прамзону мяне не пусцілі – кажуць, каб не атрымаў траўму. Увесь час у атрадзе і пад пастаянным наглядам. Выходжу толькі строем у сталовую ды прыбіраць снег (таксама пад наглядам). Снегам прыходзіцца займацца шмат, ды і ў астатні час сядзець не даюць. Як я разумею. Разлік на мой “пашпартны”



узрост і псіхічны стан пасля 3-х гадоў камеры. Але ж пасля камеры кідаць снег на свежым паветры – вялікае задавальненне. І ніхто не дачакаецца, каб я кінуў той шуфель і даў магчымасць усё зрабіць, што ім трэба, “па законе”. Прыйдзецца рабіць, як раней. Карацей, тут пакуль што ўсё ідзе па алгарытму 2011 г. Вось толькі ўсёгэта ўжо было і таму не ўражвае .

Па словах Барыса Вырвіча, з ліста бачна, што Мікалай Статкевіч знаходзіцца ў добрым псіхалагічным настроі, не зважаючы на пасілены кантроль з боку адміністрацыі шклоўскай калоніі. Палітвязень трымаецца вельмі мужна і выказвае ўпэўненасць, “што ўсё будзе добра”.

Нагадаем, што Мікалай Статкевіч быў узяты пад варту пасля падзей на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску 19 лютага 2010 года. У траўні 2011 года быў асуджаны судом Ленінскага раёна г. Мінска да шасці гадоў пазбаўлення волі ў умовах узмоцненнага рэжыму па ч. 1 арт. 293 КК (арганізацыя масавых беспарадкаў, якія суправаджаліся гвалтам над асобай, пагромамі, падпаламі, знішчэннем маёмасці і узброеным супрацівам прадстаўнікам улады). Рашэннем суда ад 12 студзеня 2012 г. умовы адбыцця пакарання былі зменены на больш жорсткія, Мікалай Статкевіч быў пераведзены з калоніі №17 у Шклове ў турму №4 г. Магілёва.

12 студзеня 2015 года палітвязень быў зноў этапаваны для далейшага адбыцця пакарання ў шклоўскую папраўчую калонію №17.

Іван Барысаў

ДУШНО!!!

(Оконч. Начало на стр. 3)

с неё. Мы тратим массу денег на все эти псевдо выборы, чтобы потом самим же страдать от наших избранников. На всех уровнях!

Наверное, народу пора задуматься, можно ли жить по принципу «моя хата с края»? Или всё-таки наша судьба в наших руках? И пора спросить хотя бы с наших избранников, а что вы! лично сделали для народа? И как собираетесь решать проблемы своих избирателей, которые сейчас в период кризиса массово теряют свою работу? Хватит держать нас за «бобиков», обвиняя в том, что мы не хотим работать. Научитесь сначала работать сами, а не создавать видимость труда.

Слушая высказывания чиновников разных уровней о «тунеядстве», я ни разу не услышала о том, чтобы они были озабочены открытием новых рабочих мест. Вопрос состоит только в том, как разработать механизм изъятия денег у так называемых «бездельников». Господа! Этот вопрос решался ещё более двух тысяч лет тому назад, оставив нам крылатое выражение «деньги не пахнут». Не стану спорить с этим классическим выражением! Но почему-то в нашей стране многих уже «тошнит» не только от «идей» власти, но уже и от созерцания несменяемых лиц. Мы, как в спальне при закрытой форточке после свадьбы, всё спим и не можем отойти от похмелья. И от нас зависит, потянется наша рука к «чарке» или распахнёт окно, чтобы протрезветь от, пусть холодного, но свежего воздуха. Душно!!!

Зинаида Милещенко

ТАКИЕ ВОТ УСПЕХИ

Более чем на 28% увеличились складские запасы на предприятиях Могилевской области в январе.

В январе 2015 г. объем промышленного производства области в текущих ценах составил 4 315,6 млрд. рублей. Индекс промышленного производства к уровню января 2014 г. - 92,1%. Запасы готовой продукции на складах промышленных предприятий области в фактических ценах на 1 февраля 2015 г. составили 3 733,8 млрд. рублей, или 111% к среднемесячному объему производства (на 1 января 2015 г. – 82,8%).

ПРАКУРОР МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ ПАСКАРДЗІЎСЯ НА НЕДАХОП УЧАСТКОВЫХ І ПРАБЛЕМЫ З ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕМ НЕПРАЦУЮЧЫХ АСОБ

Пракурор Магілёўскай вобласці Аляксандр Чадзюк даў вялікае інтэрв'ю газеце "Магілёўскія ведамасці", у якім распавёў пра стан і шляхі аздараўлення крымінагеннага становішча ў вобласці.

У прыватнасці, Аляксандр Чадзюк адзначыў тое, што на працягу апошніх гадоў колькасць зарэгістраваных злачынстваў у Магілёўскай вобласці няўхільна зніжаецца. Так, у мінулым 2014 годзе колькасць зарэгістраваных злачынстваў на Магілёўшчыне ў параўнанні з 2013г. скарацілася на 2,3%. Раней асуджанымі асобамі здзейснена на 1,7% злачынстваў менш, чым за 2013 год. Удзельная вага рэцыдыўнай злачыннасці знізілася і склала 43,0% супраць 44,3% у 2013 годзе. На 10,2% скарацілася колькасць злачынстваў, здзейсненых у стане алкагольнага ап'янення.

Разам з тым, пракурор Магілёўскай вобласці адзначыў, што на стан законнасці і правапарадка негатыўным чынам сказваецца недаўкамплектаванасць службы ўчастковых інспектароў міліцыі. Так, пры штатным раскладзе ў 429 адзінак па стане на 1 студзеня 2015 года ў Магілёўскай вобласці неслі службу толькі 378 участковых., з якіх толькі 26,5% пражывала на замацаваных адміністрацыйных участках.

Аляксандр Чадзюк агучыў інфармацыю, што, нягледзячы на пасіленне працы з боку пракуратуры і іншых суб'ектаў прафілактыкі па працаўладкаванню непрацуючых і вядучых асацыяльны лад жыцця асобаў, вынікі гэтай працы не радуюць. Згодна пракурора вобласці, ўсяго па выніках пасяджэнняў саветаў грамадскіх пунктаў аховы правапарадку з прыцягненнем кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, міліцыі, суб'ектаў гаспадарання было прынятае рашэнне аб аказанні садзейнічання ў працаўладкаванні 2 709 асобаў. Аднак рэальна працаўладкавана толькі 34,1%...

Цікава, як улады Магілёўскай вобласці збіраюцца ўладкоўваць на працу так званых "дармаедаў", калі не могуць забяспечыць працай нават сацыяльна неабароненых асобаў, квоты на працаўладкаванне якіх у загадным парадку даводзяцца шэрагу прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці?

Таксама Аляксандар Чадзюк распавёў пра тое, што ў мінулым годзе на тэрыторыі Магілёўскай вобласці зарэгістравана 802 эканамічныя злачынствы. З іх 219 – карупцыйнай накіраванасці: 77 крадзяжоў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, 28 выпадкаў злоўжывання ўладай альбо службовымі паўнамоцтвамі, 14 - перавышэння ўлады альбо службовых паўнамоцтваў, 65 фактаў атрымання і 35 дачы хабару. Удзельная вага карупцыйных злачынстваў у структуры злачыннасці склала 2,1%.

Згодна пракурора вобласці, па асноўным відам эканамічнай дзейнасці найбольшая колькасць злачынстваў выялена ў прамысловасці, адукацыі, ахове здароўя, сельскай гаспадарцы і будаўніцтве.

Між тым, кандыдат эканамічных навук з Шклоўскага раёна Пётр Мігурскі кажа, што, нягледзячы на тое, што прынята казаць пра вялікую карупцыю ў сферы адукацыі, аховы здароўя, фактычна каля 35% карупцыйных злачынстваў здзяйсняюцца "пры дапамозе" мясцовых уладаў. Ён адзначае, што ўлады на месцах не надаюць якой-небудзь рэальнай увагі барацьбе з карупцыяй, а мясцовыя праўладныя СМІ у раёнах Магілёўскай вобласці наогул абыходзяць гэтую тэму маўчаннем.

Нагадаем, што ў мінулым годзе за здзяйсненне злачынстваў карупцыйнай накіраванасці ў Магілёўскай вобласці былі прыцягнуты да адказнасці цэлы шэраг чыноўнікаў. У прыватнасці, да 14 гадоў пазбаўлення волі за карупцыйнае злачынства асуджаны былы першы намеснік старшыні Шклоўскага райвыканкама Дзмітрый Мінянкоў, узбуджаныя крымінальныя справы супраць намеснікаў старшынь Бялыніцкага, Магілёўскага і Шклоўскага райвыканкамаў, супрацоўнікаў Бабруйскага гарвыканкама, дэпутата Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу ад Магілёўшчыны, генеральнага дырэктара "Крычаўцэменташыфер" і шэрагу іншых чыноўнікаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў.



Барыс Вырвіч

У Магілёве рабочых падазраюць у крадзяжы 15 тон металу

У адносінах працаўнікоў завода "Трансмаш" распачалі крымінальную справу.

У Магілёве раскрылі злачынную групу, якая займалася крадзяжом металу з завода "Трансмаш". Як паведаміла афіцыйная прадстаўніца Следчага камітэта па Магілёўскай вобласці Аксана Салянюк, было высветлена, што яе арганізавалі чацвёра рабочых прадпрымства. Яны перапрадавалі скрадзены метал.

У працоўны час падазраваныя пагрузілі ў грузавік 15 тон легаванага металу і вывезлі яго з прадпрыемства. Пазней праваахоўнікі знайшлі яго ў на падворку прыватнага дома аднаго з рабочых, інфармуе БелаПАН.

Крымінальную справу распачалі па артыкуле "крадзеж, учынены групай асобаў".

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

ПАВЕЛ ДАНЕЙКА: «ЦЯПЕРАШНІ КРЫЗІС БУДЗЕ ДОЎЖЫЦЦА МІНІМУМ ТРЫ ГАДЫ»

Цяперашні крызіс не падобны да папярэдніх. Ён будзе доўжыцца як мінімум тры гады.

Краіну чакаюць масавыя звальненні, а многія дзяржаўныя прадпрыемствы могуць быць закрытыя.

Такое меркаванне ў інтэрв'ю Naviny.by выказаў эканаміст, генеральны дырэктар Бізнэс-школы ІПМ Павел Данейка.

- Як бы вы ахарактарызавалі тое, што цяпер адбываецца з беларускай эканомікай?

- Да таго, што адбываецца, адназначна падыходзіць слова «крызіс», але, напэўна, ён трохі незвычайны.

- А чым ён адрозніваецца, напрыклад, ад крызісу 2011 года?

- У 2011 годзе ў Беларусі быў валютны крызіс. Пасля ад гэтага вельмі моцна выйгралі экспарцёры: усе тыя, хто прадаваў сваю прадукцыю на расейскім, украінскім рынках. Яны зарабілі дастаткова значныя дывідэнды.

Цяпер у выніку крызісу прайгралі і імпарцёры, і экспарцёры. Па экспарцёрам нанесены значна больш жорсткі ўдар за кошт больш глыбокай дэвальвацыі ў Расеі і Украіне. Па гэтай прычыне мы сутыкнемся з тымі з'явамі, якіх раней не было. У прыватнасці, з беспрацоўем.

У прыватным сектары ўжо пачаліся масавыя звальненні. Дзяржаўныя прадпрыемствы іх прадоўжаць, таму што калі экспарцёры ў прыватным сектары падбітыя, ім цяжка, то, хутчэй за ўсё, цэлы шэраг дзяржаўных прадпрыемстваў проста ўжо загінулі, але яны гэтага яшчэ не ўсвядомілі. Малаімаверна адраджэнне тых рынкаў, на якіх яны працуюць.

Гэта першая асаблівасць цяперашняга крызісу.

Другая асаблівасць у тым, што мы ніколі не мелі крызісу, які быў доўга. Пасля папярэдніх крызісаў цягам паўгода наступала стабілізацыя, і далей быў рост.

Цяпер пасля стабілізацыі валютнага крызісу мы ўпершыню будзем ў сітуацыі, калі росту не будзе шмат гадоў. Гэта зусім новы стан рынку, з якім пасля 1991 года мы ніколі не сутыкаліся. Заўсёды наступны дзень прыносіў больш багаты рынак, чым учора. Цяпер мы будзем жыць у свеце, у якім заўтра нашы кліенты будуць бяднейшыя, чым учора.

- Беларускія ўлады кажуць, што гэты крызіс выкліканы знешнімі фактарамі. Яны маюць рацыю?



- Калі казаць пра ўнутраную эканоміку, то ў гэтым выпадку наш патэнцыял адаптацыі да гэтага крызісу мог бы быць вышэйшы, але гэты крызіс выкліканы абсалютна знешнімі фактарамі. Беларуская эканоміка напалову завязана на Расею.

- Як вы ацэньваеце дзеянні ўладаў па выратаванні эканомікі?

- Нацыянальны банк у нас дастаткова прафесійны. У рамках тых палітычных, сацыяльных, арганізацыйных абмежаванняў, якія ёсць, па-мойму, ён праводзіць досыць паслядоўную палітыку. А агрэсіўныя дзеянні супраць імпарцёраў адбываюцца ў рамках той парадыгмы, якая ёсць у кіраванні эканомікай. Можна абмяркоўваць, верная гэта парадыгма ці не, але калі крызіс, то ў агульным не да абмеркаванняў. Магчымыя і іншыя падыходы.

- Якія?

- Для таго каб павысіць устойлівасць нашай эканомікі, трэба пазбавіцца ад цяжару дзяржаўных выдаткаў на падтрымку нерэнтабельных дзяржаўных прадпрыемстваў. Пакуль мы гэтага не зробім, мы ўвесь час будзем знаходзіцца пад пагрозай дэвальвацыі, а наша здольнасць рэагаваць на крызісы на тых рынках, дзе мы ў асноўным працуем, будзе дастаткова абмежаваная.

- Як доўга прадоўжыцца гэты крызіс?

- У Беларусі гэта залежыць ад таго, ці будзем мы захоўваць фокус экспартнай арыентацыі на Расею ці будзе прынятая пастанова аб дыверсіфікацыі рынку. Калі будзем працаваць толькі на Расею, то тады адказ на пытанне «Як доўга?» Будзе звязаны з тым, як будзе Расея далей будаваць свае стасункі з Захадам і Украінай.

Калі адбудзецца дыверсіфікацыя, будзе прынятая пастанова не толькі на ўзроўні прыватнага, але і на дзяржаўным узроўні, то крызіс будзе доўжыцца тры гады. Гэта той цыкл, за які звычайна адбываецца перабудова мадэлі: выхад на новыя рынкі, заключэнне кантрактаў, першыя пастаўкі.

- Наколькі гэта лёгка зрабіць?

- Вядома, цяжка. Патрэбна новая кампетэнцыя, час і інвестыцыі. Выхад на новыя рынкі патрабуе грошай. У нашага бізнэсу няма адпаведных кампетэнцый і доступу да грошай, і час досыць абмежаваны, каб развязаць гэтую задачу.

ПАКУПНІК АДСУДЗІЎ У КРАМЫ 36 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ ЗА… ПЛАТНЫЯ ПАКЕТЫ

Жыхар Магілёва даказаў, што запакоўваць тавар прадаўцы павінны бясплатна.

Жыхар Магілёва выйграў суд супраць мясцовай крамы. Максім Кандраценка патрабаваў вярнуць яму 18 тысяч рублёў, якія ён патраціў на “бясплатныя” поліэтыленавыя пакеты, калі набываў прадукты. Акрамя таго, хлопец патрабаваў спагнаць з гандлёвай сеткі 2 мільёны рублёў у якасці кампенсацыі маральнай шкоды. Ленінскі раённы суд горада стаў на бок пакупніка і часткова задаволіў пазоў. У выніку Кандраценка атрымаў кампенсацыю ў 18 тысяч рублёў. Яшчэ столькі ж суддзя пастанавіла выплаціць яму ў якасці маральнай кампенсацыі. Апроч таго, крама заплаціць 540 тысяч судовых выдаткаў, паведамляе Еўрарадыё.

Максім Кандраценка кажа, што адстойваў свае грамадзянскія правы, якія яму гарантуе ўрадавая пастанова №703 ад ліпеня 2014-га, паводле якой усе ўпаковачныя пакецікі ў крамах павінны быць бясплатнымі.

Кандраценка: “Выйшла пастанова Савета міністраў. Я вырашыў праверыць, ці працуе яна. Хоць з моманту ўступлення пастановы ў законную сілу прайшло паўгода, у крамах пакецікі былі платныя. Я пацікавіўся ў прадаўцоў, ці знаёмыя яны з гэтай пастановай, ці працуюць яны ў адпаведнасці з ёй. У выніку прадаўцы сказалі, што не знаёмыя. Кіраўніцтва іх ні з чым не азнаямляла”.

Хлопец гаворыць, што для яго ў гэтай справе галоўнымі былі не грошы, а справа прынцыпу. Чаму ён мусіць плаціць за тое, што павінна быць у крамах бясплатным? Ён спадзяецца на тое, што яго судовы працэс атрымае рэзананс.

Юрыст незалежнага прафсаюза Радыёэлектроннай прамысловасці Аляксандр Хамратаў, які дапамагаў у складанні пазову Максіму Кандраценку, адзначае, што пастанову Саўміна ў Магілёве выконваюць далёка не ўсе прадаўцы.

“Але ў некаторых гандлёвых цэнтрах з гэтым праблем няма. Бясплатнай павінна быць упакоўка тавару, які не мае самастойнай упакоўкі. Напрыклад, гэта садавіна, некаторыя харчовыя прадукты, хлеб, рыба і г.д. То бок усё, што трэба ў нешта завярнуць альбо ўпакаваць”.

Хамратаў адзначае, што судовае рашэнне станоўчае, але маральная кампенсацыя вельмі малая. Суддзя палічыла, што яна не павінна перавышаць памер матэрыяльнай. Гэты момант Максім Кандраценка пры дапамозе Аляксандра Хамратава збіраецца абскардзіць у касацыйным парадку.

ДАВЕДКА:

Паводле п. 25 пастановы Савета міністраў №703 ад 22 ліпеня 2014 года, прадавец абавязаны перадаць пакупніку тавары належнай якасці ў тары альбо ўпакоўцы, за выключэннем тавараў, якія па сваім характары не патрабуюць змяшчэння ў тару альбо ўпакоўку.

Тавары перадаюцца пакупніку ва ўпакаваным выглядзе без спагнання за ўпакоўку дадатковай платы. Від упакоўкі вызначаецца прадаўцом. Выключэнне складаюць упакоўкі тартоў, набораў пірожных, напіткаў, якія прадаюцца ў разліў і кошт якіх уключаецца ў розрнічны кошт тавараў.

Шклоўскі электрык здаў на металалом чатыры трансфарматарныя падстанцыі

У Шклоўскім раёне беспрацоўны электрык разукамплектаваў чатыры трансфарматарныя падстанцыі. Зламыснік зняў з іх рубільнікі, трансфарматары і электралічыльнікі. Усё гэта ён здаў на металалом.

Аб разукамплектацыі адной з рэзервовых падстанцый на адной з фермаў заявілі ў міліцыю мясцовыя жыхары.

Праваахоўнікі затрымалі зламысніка. Ім апынуўся грамадзянін, раней ужо асуджаны за 11 крадзяжоў. Страты, якія мужчына нанёс гаспадарцы, былі ацэненыя ў 42 мільёны рублёў. Цяпер яму пагражае да чатырох гадоў турмы, паведамляе “Радыё Магілёў”.

У Бялыніцкім раёне зараз таксама пануе “металічная ліхаманка”...

КОШТЫ РАСТУЦЬ, А МЫ ЎСЁ ЧУЕМ ПРА “КВІТНЕННЕ”…

(Працяг. Пач. на стар. 1)

мы ўсё слухаем казкі пра”квітненне”.

Што самае дрэннае, бліжэйшым часам сітуацыя будзе толькі пагаршацца. Нашы вельмі разумныя ўлады заняліся пошукамі “дармаедаў”, замест таго, каб падумаць аб тым, як стварыць у тым жа Бялыніцкім раёне новыя высокааплатныя працоўныя месцы. Для каго з бялынічан з’яўляецца сакрэтам, што знайсці ў нас у раёне працу з нармальным заробкам можна толькі “па блаце”? Рэальна ў большасці існуючых у раёне арганізацый вольных працоўных месцаў няма. Можна, канешне, раздуць штаты, але чым і з якіх крыніц аплочваць працу гэтых людзей? Таму мае знаёмыя хлопцы, якія прыехалі з заробкаў у Расіі і паспрабавалі ўладкавацца на працу ў некалькіх арганізацях у Бялынічах, у рэшце-рэшт гэта зрабіць не здолелі і з’ехалі зноў у Расію, хоць і там зараз далёка не цукар. Прычым усе яны былі даволі добрыя адмыслоўцы і далёка не “булдосы”…

Пра што казаць, калі зараз ужо няма працы нават у калгасах раёна з іх “казачнымі” заробкамі. Большасць гаспадарак цалкам закрэдытавана і мне абсалютна незразумела, як яны будуць існаваць далей, калі ўлады пачнуць сапраўды выконваць мудрае ўказанне Рыгоравіча аб тым, што толькі прыбытковыя сельгаспрадпрыемствы змогуць атрымліваць дапамогу. Між тым, толькі на правядзенне веснавой сяўбы гаспадаркам Магілёўскай вобласці патрабуецца, згодна аблсельгасхарчу, каля двух трыльёнаў рублёў. І дзе іх возьмуць сельгаспрадпрыемствы, калі выручкі ад рэалізацыі прадукцыі хапае толькі на выплату заробкаў (і тое далёка не ўсім гаспадаркам Бялыніцкага раёна).

У Магілёве сітуацыя не лепшая, паважаныя чытачы. Большасць прамысловых прадпрыемстваў перайшла на скарочаны працоўны тыдзень, паўсюль пачаліся скарачэнні працуючых. Для прыкладу, за дзевяць месяцаў мінулага года колькасць работнікаў на «Магілёўхімвалакно» скарацілася больш чым на тысячу

(Заканчэнне на стар. 8)

ШКЛОЎСКАЯ КАЛОНІЯ, ДЗЕ ЎТРЫМЛІВАЕЦЦА МІКАЛАЙ СТАТКЕВІЧ, АДЗНАЧЫЛА ЮБІЛЕЙ

Шклоўская раённая газета "Ударны фронт" змясціла на сваіх старонках вялікі артыкул, прысвечаны поспехам і дасягненням мясцовай папраўчай калоніі №17. Матэрыял "ПК-17: гісторыя і сучаснасць" быў надрукаваны ў газеце адмыслова да 35-гадовага юбілею гэтай папраўчай установы, які адзначаецца ў лютым гэтага года.

Папраўчая калонія №17 агульнага і пасіленага рэжыму прызначана для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі. Як паведамляе газета "Ударны фронт", зараз у калоніі адбываюць пакаранне 1270 асуджаных па самых розных артыкулах КК – ад бытавых злачынстваў да забойстваў і карупцыйных злачынстваў. Працуе ў калоніі 65 атэставаных супрацоўнікаў. Ахову і нагляд за асуджанымі ажыццяўляюць ваеннаслужачыя 4-й асобнай стралковай роты в/ч 6713.

Калонія падзяляецца на жылую і прамысловую зоны. У вытворчай зоне – РУП "Сямнаццаць" – функцыянуе абутковая, швейная вытворчасць, дрэваапрацоўка. Згодна шклоўскай раёнкі, у калоніі 100% працаўладкаванне, за выключэннем пенсіянераў і інвалідаў. Асуджаныя занятыя на вытворчасці і на гаспадарчых працах. На дадзены момант штатная колькасць РУП "Сямнаццаць" складае 55 чалавек грамадзянскага персанала і 13 атэставанага.

У жылой зоне знаходзяцца атрадныя памяшканні, сталовая, клуб, царква і спартыўны гарадок. Згодна "Ударнага фронта", парадак у калоніі будуецца на армейскіх прынцыпах – на калідорах стаяць дзяжурныя, а інтэрнаты арганізаваны па казарменым тыпе.

За добрыя паводзіны асуджаным аб'яўляюць падзякі, выдзяляюць дадатковае спатканне з блізкімі. За парушэнні – караюць 10 суткамі ў ШІЗА альбо 6 месяцамі ў памяшканні камернага тыпу.

"Галоўная мэта нашай працы – выпраўленне асуджанага, - кажа начальнік ПК-17 палкоўнік Сяргей Ермаліцкі. - …Мы нясём адказнасць за кожнага асуджанага, за тое, якім ён выйдзе на свабоду. Таму і ўмоўна-датэрміновае вызваленне тут атрымаць не вельмі проста. Галоўнае пры гэтым – імкненне самога асуджанага да добрапрыстойнага жыцця, бо менавіта на гэтым грунтуецца рашэнне камісіі па УДВ".

Нагадаем, што ў свой час у шклоўскай ПК-17 адбывалі пакараранне цэлы шэраг беларускіх палітвязняў – Зміцер Дашкевіч, Алег Гнедчык, Аляксандар Класкоўскі, Уладзімір Лобан, Дзмітрый Новік, Арцём Пракапенка, Мікалай Дзядок. Адбывае тут свой тэрмін і кандыдат у прэзідэнты РБ на выбарах 2010 года Мікалай Статкевіч, які менавіта з шклоўскай калоніі ў лютым 2011 быў быццам бы за парушэнні рэжыму ўтрымання быў пераведзены ў Магілёўскую турму №4, а ў студзені 2015 года вернуты назад. Пасля свайго вяртання ў ПК-17 палітвязень ужо паспеў атрымаць некалькі новых спагнанняў быццам бы за новыя "парушэнні рэжыму". Для палітвязняў у "паказальнай" шклоўскай ПК-17 былі створаны вельмі цяжкія ўмовы адбыцця пакарання.

Начальніку Шклоўскай ПК-17 палкоўніку Ермаліцкаму Сяргею Уладзіміравічу ў кастрычніку 2011 года быў забаронены ўезд у краіны Еўрапейкага Саюза за жорсткае абыходжанне са зняволенымі і праслед Мікалая Статкевіча. Рашэннем кіраўніцтва Еўрапейскага Саюза ад 24 сакавіка 2012 года за ціск на палітвязняў візавыя санкцыі былі пашыраныя яшчэ на двух супрацоўнікаў "паказальнай" калоніі – Ігара Алейнікава і Вадзіма Шаменава.



Шклоўскія старажылы памятаюць, як у свой час камбінаце будаўнічых матэрыялаў і вырабаў пры калоніі, папярэдніку РУП "Сямнаццаць", працаваў і будучы кіраўнік нашай краіны Аляксандр Лукашэнка. Некаторыя з іх сцвярджаюць, што Аляксандр Рыгоравіч быў і непасрэдным супрацоўнікам ПК-17, аднак афіцыйная біяграфія кіраўніка краіны пра гэта чамусьці не ўзгадвае.

Барыс Вырвіч

КОШТЫ РАСТУЦЬ, А МЫ ЎСЁ ЧУЕМ ПРА "КВІТНЕННЕ"…

(Заканч. Пачатак на стар. 1, 7)

чалавек (15% штата). І большасць адэкватных эканамістаў адназначна прагназуюць, што далей сітуацыя ў эканоміцы вобласці будзе яшчэ горшай, без скарачэння колькасці працуючых альбо значнага памяншэння іх заробкаў прадпрыемствы проста не выжывуць.

Аднак нашых мудрых чыноўнікаў такая сітуацыя не вельмі хвалюе, яны ж "сядзяць на бюджэце". Між тым, на думку Белстата, сярэдні заробак у Беларусі цягам снежня 2014 года склаў каля 6806 тысяч рублёў (чаму я асабіста не вельмі веру), а заробак у сферы дзяржаўнага кіраўніцтва за той жа перыяд - ужо 8 539,7 тысячы рублёў. Гэта значыць радавы чыноўнік пад бой курантаў пералічваў пачак беларускіх грашовых знакаў на 25,5% больш, чым сярэдні эканамічна актыўны абывацель.

Таму, паважаныя нашы чыноўнікі, не трэба "ля-ля" наконт росквіту і павышэння дабрабыту насельніцтва раёна. Магчыма, вы проста блытаеце ўласныя поспехі ля кармушкі з "дасягненнямі" шэраговых белынічан, выжываць якім становіцца ўсё складаней.

І трэба казаць не пра поспехі і "выкананне задання па росту заработнай платы за 2014 год у раёне на 101%", а пра тое, што за гэтыя грошы можна рэальна набыць зараз.

Іван Барысаў

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем выдаўца газеты.

Адрас рэдакцыі: 213173, Бялыніцкі раён, аг-к Вялікая Машчаніца, вул. Савецкая, д. 4. Тэл. 8 (02232) 37-365. E-mail: boris196608@bk.ru. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Наклад 299 асобнікаў. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 18.02. 2015 г. у 20-00.